Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»
**Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка**

# ДУШЫ ПАЭТЫЧНАЙ ЗАГАДКА

***ДА 70-ГОДДЗЯ ЛЮДМІЛЫ АНТОНАЎНЫ КЕБІЧ***

Бібліяграфічны даведнік



ГРОДНА 2021

Дзяржаўная ўстанова культуры
«Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна»
**Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка**

# ДУШЫ ПАЭТЫЧНАЙ ЗАГАДКА

## *ДА 70-ГОДДЗЯ ЛЮДМІЛЫ АНТОНАЎНЫ КЕБІЧ*

Бібліяграфічны даведнік

ГРОДНА 2021

УДК 016:821.161.3.09(095)(476.6)
ББК 83.3(4Беи–4Гро)я2
Д 86

Укладанне :
*Ю. Ю. Жыткевіч*

Пад агульнай рэдакцыяй :
*І. М. Ілюшына*

**Душы паэтычнай загадка : да 70-годдзя Людмілы Антонаўны Кебіч : бібліяграфічны даведнік / Дзяржаўная ўстанова культуры «Цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма г. Гродна» ; Гродзенская гарадская цэнтральная бібліятэка імя А. Макаёнка ; складальнік Ю. Ю. Жыткевіч ; пад агульн. рэд. І. М. Ілюшынай. – Гродна, 2021. – 57 с.**

Выданне прысвечана беларускай паэтэсе, празаіку, перакладчыку, педагогу, грамадскаму дзеячу, ганароваму члену Саюза пісьменнікаў Беларусі, члену Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы і Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў (МАПП), старшыні Гродзенскага абласнога аддялення «Саюз пісьменнікаў Беларусі» ***Людміле Антонаўне Кебіч***.

Матэрыялы бібліяграфічнага паказальніка размешчаны ў асноўным у алфавіце аўтараў і загалоўкаў. У некаторых раздзелах быў выкарыстаны лагічны спосаб групавання крыніц інфармацыі. Бібліяграфічнае апісанне падпарадкоўваецца ДГСТу 7.1–2003 «Бібліяграфічны запіс. Бібліяграфічнае апісанне. Агульныя патрабаванні і правілы састаўлення».

Бібліяграфічны паказальнік будзе карысны краязнаўцам, пісьменнікам, супрацоўнікам музеяў, сродкаў масавай інфармацыі, выкладчыкам, педагогам, студэнтам і навучэнцам устаноў, бібліятэкарам і ўсім, хто цікавіцца жыццём і творчасцю пісьменнікаў Беларусі.

**УДК 016:821.161.3.09(095)(476.6)**
**ББК 83.3(4Беи–4Гро)я2**

# ЗМЕСТ


АДКУЛЬ ЁСЦЬ ПАЙШЛА… ....................................................................4
БІБЛІЯГРАФІЯ ....................................................................17
ТВОРЫ ЛЮДМІЛЫ КЕБІЧ ....................................................................17
Асобныя выданні ....................................................................17
Публікацыі ....................................................................18
Паэзія ....................................................................18
Кніжныя публікацыі ....................................................................18
Публікацыі ў перыядычных выданнях ....................................................................20
Проза ....................................................................25
Творы ....................................................................25
Падзеі, гутаркі ....................................................................26
ПРА ЛЮДМІЛУ КЕБІЧ І ЯЕ ТВОРЧАСЦЬ ....................................................................29
Кніжныя публікацыі ....................................................................29
Зборнікі навуковых артыкулаў ....................................................................29
Матэрыялы навуковых канферэнцый ....................................................................30
Публікацыі ў перыядычных выданнях ....................................................................31
Электронныя рэсурсы ....................................................................34
ІМЯННЫ ПАКАЗАЛЬНІК ....................................**Ошибка! Закладка не определена.**
СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ ....................................................................36
ЭЛЕКТРОННАЯ ВЫСТАВА ТВОРЧАСЦІ ЛЮДМІЛЫ КЕБІЧ ....................................................................37
ФОТАГАЛЕРЭЯ ....................................................................43




## АДКУЛЬ ЁСЦЬ ПАЙШЛА...



**Беларуская паэтэса, празаік, публіцыст, перакладчык, педагог, грамадскі дзеяч. Ганаровы член Саюза пісьменнікаў Беларусі. Член Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, член Міжнароднай асацыяцыі пісьменнікаў і публіцыстаў. Старшыня Гродзенскага абласнога аддзялення «Саюз пісьменнікаў Беларусі» (з 2005).**

**Лаўрэат прэміі імя А. І. Дубко Гродзенскага аблвыканкама «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва» ў намінацыі «Пісьменнік года–2002» і «Пісьменнік года–2022». Лаўрэат абласной прэміі «Чалавек года Гродзеншчыны» (2013). Пераможца Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «Лепшы твор года» ў намінацыі «Песенны жанр» за цыкл песень «Словы прызнання» – «Залаты Купідон» (2010). Пераможца ІІІ Гродзенскага абласнога літаратурнага конкурсу імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч) у намінацыі «Паэзія» (2020).**

**Узнагароджана нагрудным знакам «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2009), нагрудным знакам Міжнароднага Саюза пісьменнікаў і майстроў мастацтва «Ганаровы настаўнік творчай моладзі» (2020), медалямі Францыска Скарыны (2014), Саюза пісьменнікаў Беларусі «За вялікі ўклад у літаратуру» (2018).**

Людміла Антонаўна Кебіч нарадзілася 17 ліпеня 1951 года ў гарадскім пасёлку Краснасельскі Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і настаўнікаў.



**Вайтулевіч Антон Іосіфавіч**

Тата, Вайтулевіч Антон Іосіфавіч, нарадзіўся 22 лістапада 1923 года ў вёсцы Дзяцелаўцы Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці ў сям'і сялян. Прайшоў шлях ад рабочага-маляра да настаўніка гісторыі Краснасельскай сярэдняй школы. Ветэран Вялікай Айчынай вайны. Удзельнічаў ва ўзяцці Берліна. Мае баявыя ўзнагароды: ордэн Славы (ІІІ ступені), медалі «За вызваленне Варшавы», «За ўзяцце Берліна», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», ліст «Падзяка Вярхоўнага Галоўнакамандуючага І. Сталіна ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны», шматлікія юбілейныя медалі, у тым ліку медаль Жукава.

Марыў паступіць на вакальнае аддзяленне музычнага вучылішча і стаць оперным спеваком, але перашкодзіла вайна і ўнесла свае карэктывы.

Пасля вайны скончыў гістарычны факультэт Магілёўскага дзяржаўнага педінстытута (1969 год). Працаваў настаўнікам малярнага дзела (з 01.09.1960 года), з 1965 года – настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства ў Краснасельскай

сярэдняй школе Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці. Вельмі таленавіты і творчы чалавек. Граў на многіх музычных інструментах: акардэон, гітара, мандаліна, балалайка. Пісаў карціны маслам, складаў вершы, меў прыгожы лірычны тэнар. Антон Іосіфавіч ўвесь час нешта майстраваў, плёў кашы, захапляўся мовамі – чытаў на чэшскай, балгарскай, украінскай, добра гаварыў па-польску і па-нямецку, дапамагаў пісаць кантрольныя і дыпломныя работы студэнтам. Любіў працаваць на лецішчы, прышчапляць дрэвы новымі сартамі. За тыдзень да дня нараджэння дачкі Людмілы зрабіў незвычайны падарунак – заняў другое месца ў абласным першынстве 1951 года па веласіпедным спорце ў шашэйнай гонцы на 50 кіламетраў. За высокія дасягненні ў працы неаднаразова ўзнагароджваўся Ганаровымі граматамі і каштоўнымі падарункамі, напрыклад, у 1965, 1976 гадах, а ў 1984 годзе – медалём «Ветэран працы». Памёр 22 жніўня 2002 года. Пахаваны на Краснасельскіх могілках.

Маці, Вайтулевіч Зінаіда Васільеўна (у дзявоцтве Шакалей), нарадзілася 1 кастрычніка 1925 года ў вёсцы Грыбаўцы Ваўкавыскага раёна (цяпер Мастоўскі раён) Гродзенскай вобласці ў сям'і сялян. У 1947 годзе скончыла Гродзенскае педагагічнае вучылішча. Працавала ў Краснасельскай сярэдняй школе амаль сорак гадоў: з 15.08.1947 года па 01.09.1986 год. Узнагароджана медалём «Ветэран працы», Ганаровымі граматамі, падзячнымі лістамі і каштоўнымі падарункамі (1966, 1969, 1976 гады і інш.).



**Зінаіда Васільеўна Вайтулевіч**

Усё жыццё Зінаіда Васільеўна пісала вершы для сваіх вучняў і сваіх дзяцей. Яе вершы высока ацаніў беларускі пісьменнік Максім Танк, параіў выдаць кнігу з вершамі.

Кнігу яе вершаў дапамагла выдаць дачка, Людміла Антонаўна, – да 75-гадовага дня нараджэння. Называецца яна «Вясёлы дзянёк» (2001, Гродна). Зінаіда Васільеўна была сапраўднай майстрыхай-рукадзельніцай: шыла, вышывала, вырабляла дываны, вязала. Пісала вершаваныя сцэнарыі на школьныя і раённыя агляды мастацкай самадзейнасці. Памерла 15 мая 2007 года. Пахавана на Краснасельскіх могілках.



**Вайтулевіч Антон Іосіфавіч**
**і Зінаіда Васільеўна, бацькі Людмілы Кебіч**

Ад таты ў Людмілы Антонаўны – музычныя здольнасці і невычэрпны аптымізм. Ад мамы – літаратурныя і ўсе астатнія.

Вучылася з 1958 па 1967 год у Краснасельскай сярэдняй школе, адначасова – мясцовай музычнай школе па класе фартэпіяна.

Першы верш пад назваю «Вясна» Людміла напісала ў першым класе (1959 год). У школе была выдатніцай. Марыла скончыць 10 класаў і паступаць на журналістыку ці філфак. На гэта спадзяваліся і яе любімыя настаўнікі рускай і беларускай моваў – Людміла Казіміраўна Кавецкая і Мікалай Паўлавіч Януш. Але, пасля дзявятага класа, у 1967 годзе яна паступіла на адзяленне тэорыі музыкі ў Маладзечанскае музычнае вучылішча.

Падчас вучобы ў музычным вучылішчы, пасля трэцяга курса Людміла выйшла замуж за аднакурсніка-баяніста Кебіча Генадзія Іванавіча. Па размеркаванню яны трапілі спачатку ў горад Ваўкавыск, на радзіму Людмілы, дзе год працавалі ў дзіцячай музычнай школе, а затым пераехалі ў Гродна. Уладкаваліся на працу ў культурна-асветнае вучылішча (цяпер УА «Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў»).

Пасля музычнага вучылішча Людміла паступіла на філалагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага педінстытута імя Янкі Купалы (1976 год), які скончыла завочна ў 1981 годзе.

Муж Людмілы Антонаўны, Кебіч Генадзій Іванавіч, нарадзіўся 15 мая 1948 года ў вёсцы Цябуты Валожынскага раёна Мінскай вобласці ў сям'і сялян. Скончыў Валожынскую дзесяцігодку, адначасова музычную школу па класе баяна. Паступіў у Маладзечанскае музычнае вучылішча на аддзяленне народных інструментаў. Пасля першага курса яго забралі на два гады ў армію, служыў пад Мінскам у Масюкоўшчыне. Пасля службы вярнуўся на вучобу. У дзяцінстве праявіліся здольнасці да музыкі і малявання. Граў на баяне з трох гадоў, выпільваў з дрэва цудоўныя рэчы, займаўся мастацкай фатаграфіяй, наведваў духавы аркестр і яшчэ цэлы шэраг розных гурткоў. Меў таксама вялікі інтарэс да радыётэхнікі, які ўзнік ў арміі, і ваенныя кіраўнікі прапанавалі хлопцу паступаць ў радыётэхнічны інстытут, абяцалі нават дапамогу. Але Генадзій Іванавіч марыў толькі пра музыку.

Да апошніх дзён жыцця працаваў у гімназіі № 5 канцэртмайстрам узорнага харэаграфічнага ансамбля «Вярбіначка», акампаніятарам у класе вакала, рабіў аранжыроўкі і фанаграмы твораў, складаў свае. Памёр 29 верасня 2021 года.



**Першы канцэрт-падзея ў Гродне. Людміла і Генадзій Кебічы выконваюць свой твор «Вулкі Гародні», 2014**

Генадзій Іванавіч Кебіч – аўтар трох зборнікаў песень на словы Людмілы Кебіч і іншых паэтаў: «Чароўны лістапад» (1998), «Словы прызнання» (2011) і «Гродна, ты – мой лёс, мая паходня» (2013). За зборнік песень на словы Людмілы Кебіч атрымаў Дыплом лаўрэата рэспубліканскага конкурсу «Лепшы твор года» ў 2009 годзе ў намінацыі «Песенны жанр».

Неаднаразова ўзнагароджваўся за асобныя творы граматамі Саюза кампазітараў Беларусі, асацыяцыі кампазітараў Гродзеншчыны. Як выкладчыка вучні яго паважалі і любілі.

Генадзій Іванавіч першы ў свой час у горадзе адкрыў курсы ігры на класічнай і эстраднай гітары і навучаў усіх жадаючых. Першы ён таксама адкрыў клас сінтэзатара ў гімназіі № 5. Гэта сведчыць пра крэатыўнасць мыслення выкладчыка, яго жаданне ісці ў ногу з часам, зрабіць навучанне музыкай цікавым і захапляльным.

Музыка заўсёды была фонам жыцця Людмілы і Генадзія, прыгожым і натхняльным.

Людміла Кебіч шчаслівая матуля і бабуля – мае трох дзяцей і чатырох унукаў.



**Пасля сустрэчы з чытачамі.
У офісе ГрСПБ, 2016**

У Гродзенскім дзяржаўным каледжы мастацтваў Людміла Антонаўна працавала з 1972 па 2009 год. Прайшла шлях ад выкладчыка музычна-тэарэтычных дысцыплін да намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце. Творчы асяродак каледжа спрыяў раскрыццю, развіццю і ўдасканаленню яе літаратурных здольнасцяў. Людміла Антонаўна пісала сцэнарыі мерапрыемстваў, складала песенныя тэксты, віншавальныя оды. Да 60-годзя ўтварэння каледжа адміністрацыя пасадзейнічала ў выданні кнігі «Светач мастацтва» (2008, Гродна) Людмілы Кебіч, зместам якой стала адлюстраванне падзей у віншаваннях і прысвячэннях, вершаваная гісторыя каледжа.

Працуючы ў каледжы, Людміла Антонаўна атрымала шматлікія граматы Міністэрства культуры і Міністэрства адукацыі, дыпломы за педагагічную, выхаваўчую, метадычную і творчую дзейнасць. За сцэнарый свята «У нас уваходзіны», напісанага сумесна з выкладчыцай каледжа Валянцінай Іосіфаўнай Міхно, атрымала Сярэбраны Дыплом (2-ое месца) ВЦСПС, Міністэрства культуры СССР, Міністэрства ўнутраных спраў СССР і ЦК ВЛКСМ на Усесаюзным конкурсе на лепшы сцэнарый (1987, Ленінград). Яшчэ некалькі сцэнарыяў увайшлі ў метадычныя дапаможнікі па арганізацыі культурна-дасугавай дзейнасці, выдадзеныя ў Мінску. Былы дырэктар каледжа, арганізатар і рэжысёр абласных і рэспубліканскіх святаў Сяргейчык Уладзімір Міхайлавіч адкрыў у Людмілы Антонаўны здольнасці сцэнарыста і рэжысёра. Прыцягнуў яе да ўдзелу ў Рэспубліканскім фестывалі нацыянальных культур, які кожныя два гады адбываецца ў Гродне, у якасці рэжысёра свята паэзіі «Кожны народ песняра свайго мае» і свята дзіцячай паэзіі «Зялёнае лета» (2000, 2002, 2004, 2006, 2008, 2010, 2012, 2014, 2016).

Першыя вершы Людмілы Кебіч былі надрукаваны ў 1962 годзе ў газетах «Піянер Беларусі» і «Зорька». З таго часу яна пачала пісаць артыкулы пра школьныя мерапрыемствы і піянерскія справы ў раённую газету «Знамя Октября» (горад Ваўкавыск), цяпер яна называецца «Наш час».

Першую кнігу вершаў *«Па музычных законах»* Людміла Антонаўна выдала ў 1996 годзе ў Ваўкавыскай друкарні. Кніга выйшла накладам у 500 асобнікаў. У ёй змешчаны вершы пра каханне, родную зямлю і прыроду, першая паэма «Бакаляраўшчына».



Людміле Антонаўне заўсёды шанцавала на сустрэчы з добразычлівымі людзьмі. Адзін з іх – пісьменнік Алесь Герасімавіч Масарэнка. У канцы 80-х гадоў, яна разаслала свае вершы ва ўсе беларускія выданні, дзе былі літаратурныя старонкі ці гасцёўні. На працягу наступных трох гадоў вершы былі надрукаваны, амаль усе – у часопісах «Маладосць», «Работніца і сялянка», «Беларусь», «Крыніца», у газеце «Чырвоная змена», дзе маладымі паэтамі займаўся Алесь Герасімавіч. Праз некалькі гадоў Алесь Масарэнка стаў рэдактарам другой кнігі вершаў Людмілы Кебіч *«Зялёная рутвіца»*, якая выйшла ў выдавецтве «Беллітфонд» у 2001 годзе. За гэтую кнігу яе прынялі ў Саюз беларускіх пісьменнікаў, і дзякуючы якой Людміла Антонаўна стала лаўрэатам прэміі імя А. І. Дубко Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта «За творчыя дасягненні ў галіне культуры і мастацтва ў 2002 годзе» ў намінацыі «Пісьменнік года».



**Свае кнігі таксама карысна перачытваць!**
**Дома, 2015**

З гэтага часу пачалася свядомая літаратурная дзейнасць Людмілы Кебіч. Яна пісала вершы, артыкулы, шэсць гадоў працавала ў газеце Гродзенскай друкарні «Аркуш» рэдактарам літаратурнай старонкі, выдавала кнігі.

У 2003 годзе выйшаў зборнік вершаў і апавяданняў *«На беразе белай ракі»* (Гродна). У 2005 годзе выдала зборнік духоўнай лірыкі *«Ключы ад неба»* ў выдавецтве «Про Хрысто» (Мінск), дзякуючы

рэдакфестиваляару Хрыстыне Лялько.

У 2007 годзе – кнігу вершаў і мініяцюр для дзяцей *«Фиолеовый дракоша»* на рускай і беларускай мовах. У 2008 годзе – *«Светач мастацтваў»* – вершаванае адлюстраванне падзей і гісторыі каледжа мастацтваў (да 60-годзя ўтварэння УА «Гродзенскі дзяржаўны каледж мастацтваў»). У гэтым жа 2008 годзе ў серыі «Бібліятэка Саюза пісьменнікаў Беларусі» ўбачыла свет кніга вершаў і паэм *«Непераможны колер охры»* (выдавецтва «Харвест»).

Нізка вершаў і песня «Вясна ідзе» ўвайшлі ў падручнік «Музыка» для другога класа, выдадзенага ў выдавецтве «Беларусь» у 2006 годзе, па ім спасцігаюць музычную грамату дзеці нашай краіны. Пры перавыданні падручніка «Музыка» ў 2012 годзе ў яго ўвайшлі новыя вершы Людмілы Кебіч. Вясною 2010 года вершы паэткі змясцілі ў новую хрэстаматыю па беларускай літаратуры для навучэнцаў старэйшых класаў.

Другі раз вершы былі надрукаваны у польскіх альманахах, якія выдаюцца літаратурным аб'яднаннем беларусаў Польшчы «Белавежа» ў Беластоку: першы раз гэта былі пераклады вершаў Віктарам Шведам у альманаху «Гнёзды слоў – словы гнёзд» (2006), другі раз – у штогодніку «Тэрмапілы» (2009).

У 2012 годзе выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя Пятруся Броўкі» пачало выдаваць зборнікі сучаснай беларускай паэзіі для школьных і публічных бібліятэк. У першы зборнік «Фантазія творцы» патрапілі 140 вершаў і дзве паэмы Людмілы Кебіч. У 2013 годзе выйшаў другі зборнік пад назваю «На мове сэрца», у якім змешчаны творы толькі трох аўтараў, сярод іх і вершы Людмілы Антонаўны.



**Прэзентацыя літаратурнага альманаха «На Нёманскай хвалі»
ў гімназіі № 5 г. Гродна, 2011**

У 2014 годзе пабачылі свет ужо дзве новыя кнігі: дакументальная аповесць для падлеткаў *«Дамінанты лёсу»* і нарыс пра горад, у якім паэтка жыве, *«Гродно – город королей»*, кніга прызначана для школьнікаў.

У 2016 годзе выйшлі дзве кнігі: зборнік паэзіі *«Рай для адзіноты»* і кніга для дзяцей *«Як Алеся пальчыкі лічыла»*.




**Прэзентацыя кнігі вершаў «Рай для адзіноты» ў СШ № 38 г. Гродна, 2017**




У 2018 годзе – кніга для дзяцей *«Игрушки для Валюшки»*, якая прымеркавана да 18-ці гаддзя ўнучкі Валянціны. У гэтым жа годзе Людміла Антонаўна выступіла ў ролі перакладчыка твораў польскага пісьменніка Аляксандра Наўроцкага і выпусціла кнігу яго прозы *«Цень яго Анёла»* ў перакладзе на беларускую мову. Падчас фестывалю паэзіі ў Варшаве за гэты пераклад Людміла Кебіч была прызнана лепшым перакладчыкам з польскай мовы ў 2018 годзе і атрымала ўзнагароду ў выглядзе срэбранага пярсцёнка з выяваю арла і дыплом.

У 2019 годзе выйшла з друку новая кніга беларускіх вершаў пад назваю *«Бэзавы дом»*, у ёй сабраны вершы, прысвечаныя малой і вялікай Радзіме.



**Прэзентацыя кнігі Людмілы Кебіч «Бэзавы дом» у бібліятэцы № 10 г. Гродна, 2020**



У 2020 годзе надрукаваны тры кнігі Людмілы Кебіч. Першая – гэта кніга для дзяцей *«У Марьяны сто фантазий»*, другая – таксама для дзяцей – *«Бэрак, Бэрак, дай цукерак!»* (выдавецтва «Народная асвета», Мінск), і трэцяя – кніга вершаў *«Трыялеты, тэрцыны, рандэлі»*, рукапіс якой перамог у абласным літаратурным конкурсе рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

У 2021 годзе выйшла кніга Людмілы Антонаўны *«Владеющий миром спорта: повесть о Владимире Чигиринове»*. У гэтым жа, 2021 годзе пабачыла

свет кніга *«Пакінуць след на зямлі»*, у якую ўвайшлі дванаццаць нарысаў пра людзей Гродзеншчыны.



**Прэзентацыя кнігі Людмілы Кебіч «Владеющий миром спорта: повесть о Владимире Чигиринове» ў абласной бібліятэцы імя Я. Карскага, 2021**

Музыка ішла побач усе гады разам з Людмілай Кебіч. Беларускія кампазітары В. Войцік, Л. Захлеўны, Я. Паплаўская, А. Елісеенкаў, вядомыя гродзенскія музыкі Я. Петрашэвіч, А. Пухаў, А. Чопчыц, А. Маркелаў, М. Коп і іншыя ў розныя гады напісалі музыку на вершы Людмілы Кебіч.

Шмат выступалі з мужам Генадзем Кебічам з канцэртамі як аўтары і выканаўцы ўласных песень. Яскравым прыкладам спалучэння музыкі і паэзіі ў жыцці паэткі, сведчаннем правільнасці абранага шляху, з'явілася таксама кніга *«Гродна ў вершах і песнях: і памяць, і пашана, і любоў»* (2008, выдавецтва «Гродзенская друкарня»), прысвечаная 880-годдзю заснавання горада. У зборнік увайшлі вершы і песні з нотамі гродзенскіх паэтаў і кампазітараў. Укладальнікамі сталі Л. Кебіч і А. Ласмінскі.

У 2005 годзе Людміла Кебіч уступіла ў Саюз пісьменнікаў Беларусі. Яна з'яўляецца стваральнікам Гродзенскага абласнога аддзялення «Саюз пісьменнікаў Беларусі», якое ўзначаліла. Сёння ў ім больш за сорак членаў – празаікаў, паэтаў, публіцыстаў.

У апошні час Людміла Антонаўна піша прозу і публіцыстыку. Хоць лічыць, што «паэзія – мой галоўны накірунак, бо гэта не толькі адзін з відаў мастацтва, але асобы строй душы, лад жыцця. Для мяне паэзія – своеасаблівае душасховішча, скрынка на боль, скарбонка надзей, свята на кожны дзень. Ды, відаць, даспела і да прозы…».

Публіцыстычныя нарысы *«Большой судьбы поля и реки»* – пра Героя Савецкага Саюза І. Д. Лебедзева, які жыў у Гродне, *«Устроительница»* – пра старшыню Гродзенскага абласнога прафсаюза работнікаў культуры Т. В. Іванову, надрукаваны ў часопісах «Нёман», адпаведна – № 6 за 2008 год і № 5 за 2009 год, нарыс *«Артыст, змагар, паэт»* – пра невядомага дагэтуль партызанскага паэта Аляксандра Міхайлава – у газеце «Літаратура і мастацтва» – ў маі 2010 года.

Першае апавяданне *«Выбух»* надрукавана ў сакавіку 2010 года ў калектыўным зборніку празаічных твораў пра каханне «Самая чароўная кветка», які штогод выходзіць у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў серыі «Вера, надзея, любоў». Затым, у 2012 і 2014 гадах там жа выйшлі аповесці *«Другі дубль»* і *«До, рэ, мі, фа, соль, ля, сі, або Канцавая станцыя»*. У часопісе «Полымя» – апавяданне *«Манька»* (№ 10, 2012) і аповесць *«Сама, сама, сама, сама, сама…»* (№ 9, 2013).

Паэзія з'яўляецца «камертонам», па якім Людміла Антонаўна настройвае празаічны тэкст. «Як Бах вывяраў музычную гармонію алгебрай, так Людміла Кебіч прозу – паэзіяй».



**Уручэнне прэміі «Залаты купідон» за перамогу ў літаратурным конкурсе «Лепшы твор 2009 года» ў галіне песеннага жанру за цыкл песень «Словы прызнання», Хойнікі (Гомельская вобласць), 2010**

У 2009 годзе, падчас Свята беларускага пісьменства ў Смаргоні, паэтка атрымала ўзнагароду – нагрудны знак «За ўклад у развіццё культуры Беларусі». У 2010 годзе, на Свяце беларускага пісьменства ў Хойніках, Людміле Антонаўне былі ўручаны дыплом першай ступені і статуэтка «Залаты Купідон» за перамогу ў літаратурным конкурсе «Лепшы твор 2009 года» ў галіне песеннага жанру за цыкл песень «Словы прызнання».

Гэта значыць, што песенныя вершы Людмілы Кебіч прызнаны ў 2009 годзе лепшымі ў рэспубліцы. Паэтка з'яўляецца «Чалавекам года Гродзеншчыны ў грамадска-палітычнай сферы за 2013 год». У 2014 годзе атрымала медаль Францыска Скарыны. А ў 2020 годзе стала адной з пераможцаў абласнога літаратурнага конкурсу рукапісаў імя Цёткі (Алаізы Пашкевіч) у намінацыі «Паэзія».

Вершы паэтэсы перакладзены на рускую, украінскую, азербайджанскую, літоўскую і польскую мовы.



Творчасць Людмілы Кебіч атрымала высокую адзнаку ў літаратурнай крытыцы.

Дацэнт кафедры беларускай літаратуры ГрДУ імя Янкі Купалы, кандыдат філалагічных навук, літаратуразнавец, крытык Руслан Казлоўскі вось як кажа пра творчасць паэтэсы: «Музычны педагог па адукацыі і дзейнасці, чалавек чуйнай душы, Людміла Кебіч тонка ловіць павевы часу, успрымае адмоўныя і станоўчыя бакі жыцця, каханне і здраду, дабро і зло, глядзіць на свет эмацыйнымі вачыма паэткі, якая ўспрымае рэчаіснасць у фарбах, гуках і рытмах.

Для паэзіі Людмілы Кебіч характэрна выяўленне эмацыйных уражанняў, эстэтычна афарбаваных роздумаў, пазарацыянальных адчуванняў і памкненняў.

Сістэма мастацка-выяўленчых сродкаў скіравана на раскрыццё цэльнай асобы лірычнага героя (гераіні), рухаў чалавечай душы. Ствараецца адзіная філасофская канцэпцыя творчасці, ідэйна-сэнсавымі дамінантамі якой з'яўляюцца вечныя праблемы і тэмы: сэнсу чалавечага існавання, жыцця і смерці, любові і нянавісці, суадносін духоўнага і цялеснага, боскага і людскога.

У творчасці Людмілы Кебіч выразна адчуваюцца менталітэт часу і месца стварэння вершаў, побытавыя і пэўныя гістарычныя абставіны.

Асобая старонка – дзіцячыя творы. Вершы, абразкі і мініяцюры securiзнабакова паказваюць радасці і праблемы малечы. Героі вершаў – алегорыі – вельмі трапныя, лёгка ўспрымаюцца, бачны дакладны разлік на дзіцячую аўдыторыю.

Творчасць Л. Кебіч – яскравая старонка сучаснага літаратурнага жыцця Гродзеншчыны».

Беларускі літаратуразнавец, краязнавец Аляксей Пяткевіч піша пра творчасць паэткі наступнае: «Творчасць Гродзенскай паэткі Людмілы Кебіч – гэта яскравая старонка літаратурнага жыцця Гродзеншчыны. Паэзія Людмілы Кебіч – чыстая, як чалавечае дыханне, яна нясе ў сабе сілу народнага духу. Гэта не стылізацыя, а тонкае ўменне перадаць народную этыку, мараль і філасофію жыцця. Гэтыя вершы дапамагаюць адчуваць жыццё ў яго самых лепшых праявах, адчуваць свой народ і яго душу».

А вось як характарызуе творчасць Людмілы Кебіч пісьменніца, філолаг Ніна Каленчыкава: «Кебіч бярэ ў палон моваю… У Людмілы Кебіч адмысловая мова, трапная метафорыка, пульсуючая думка… І даволі многа вобразных знаходак. Перад вачыма паўстаюць тыя прыродныя з'явы, якія ты і не дадумаўся б так абазначыць… Застываеш у тым дзіўным здранцвенні, якое можна выказаць адным словам: цудоўна! Светла і чыста, ненадакучліва піша пра тое, пра што ўжо казалі іншыя. Яе паэзію ўспрымаеш з адчуваннем навізны, кранальнай чысціні. І разумееш, што перад табою паэзія не розуму і старання, а таленту і моўнай інтуіцыі.

Вершы Кебіч – тужліва-светлыя, датклівыя. У іх адчуваецца журботная задуменнасць, а то і філасофскі роздум.

Неад'емнасць новых пошукаў і адкрыццяў у творчасці Кебіч гарманічна нітуецца з класічнай традыцыяй, якая пульсуе ў яе вершах, як кроў у венах.

Па-першае, яна ўзнаўляе так званыя цвёрдыя формы ў паэзіі – трыялеты, тэрцыны, рандэлі.

Па-другое, мастацкія адкрыцці Кебіч заўсёды нараджаюцца ў дыялогу са сваімі вялікімі сучаснікамі і папярэднікамі.

Паэзія як бы ўздымае нас над бытам, уводзіць у іншае вымярэнне жыцця (у катэгорыях агульначалавечага, духоўнага, божаскага) – і набліжае нас да Стваральніка».

Беларуская пісьменніца Ірына Масляніцына піша пра творчасць Людмілы Антонаўны так: «Па паэтычных кнігах Людмілы Кебіч разліта цэлая палітра асабістых пачуццяў, што ўзнікаюць ад сузірання хараства і дасканаласці створанага Богам сусвету.

Вясна, якая штогод прыходзіць у цеплыні і пяшчоце сваёй, нагадваючы пра Дараванне і Рай.  Напоўненае птушынымі спевамі і «белагрудымі аблачынамі» неба над жытнёвым полем, «дзе жнейкі сонечным праменем перапаясваюць снапы».

Тое, што светам кіруе любоў, для Людмілы Антонаўны рэч, якую не трэба нават і даказваць. Вера і паэзія для Людмілы Кебіч непарыўна звязаныя. І таму абедзве яны – вытокі маладосці душы. Гэта – яе асабістая філасофія, тым не менш блізкая многім творцам.

Магутны стрыжань характару, устойлівы і непахісны, як зямная вось, мацуе Людмілу Кебіч, якая, здаецца, дзякуючы сваёй веры і сваёй паэзіі застанецца стаяць на нагах, нават калі ўвесь свет паўстае на галаву».
















Людміла Кебіч актыўна ўдзельнічае ў грамадскім і культурным жыцці не толькі Гродна і Гродзенскай вобласці, але і Беларусі. Праводзіць *прэзентацыі сваіх кніг*: «Бэзавы дом» у бібліятэцы № 10 г. Гродна (2020), «Владеющий миром спорта : повесть о Владимире Чигиринове» у абласной бібліятэцы імя Я. Карскага (2021) і інш.;  удзельнічае *ў сустрэчах з чытачамі*: пісьменнікі ГрСПБ ў Дзятлаўскай раённай бібліятэцы (2013), традыцыйныя снежаньскія сустрэчы ў Гудзевіцкім (Мастоўскі р-н) літаратурна-краязнаўчым музеі (2021), ў Ваўкавыскай раённай бібліятэцы падчас тура грамадзянскай паэзіі (2011) і інш.; у сустрэчах *са студэнцкай моладдзю*: паэтычная сустрэча  з навучэнцамі Гродзенскага каледжа бытавога абслугоўвання насельніцтва (2010), з замежнымі студэнтамі і інш.; удзельнічае ў адкрыцці выстаў гродзенскіх мастакоў: выстава карцін Мікалая Бандарчука ў Гродзенскай выставачнай зале, выстава гродзенскіх мастакоў у карціннай галерэі на вул. Ажэшкі (2011) і інш.;

*арганізуе вечарыны паэзіі*: вечар каляднай паэзіі ў Новым замку разам з Саюзам палякоў на Беларусі (2018), вечар духоўнай музыкі і паэзіі і інш.; *бярэ ўдзел у розных фестывалях*: у першым фестывалі «Кніжныя скарбы краіны» ў г. п. Свіслач, (2017), у Міжнародным фестывалі паэзіі ў Варшаве (2017, 2018, Польшча), і інш.; *у акцыях*: «Ацаляльнае слова» ў дзіцячай паліклініцы № 7 г. Гродна (2018) і інш.; выступае *на тэлеперадачах*: «Окна города» (Гродна, 2021), «Дыяблог» Алены Трацэнка (Гомель, 2016) і інш.




**Падчас Міжнароднага фестывалю паэзіі ў Варшаве (Польшча), 2018**



**У аддзеле абслугоўвання дзяцей Гродзенскай гарадской цэнтральнай бібліятэкі імя А. Макаёнка, 2018**



# БІБЛІЯГРАФІЯ

## ТВОРЫ ЛЮДМІЛЫ КЕБІЧ

### Асобныя выданні


1. Бэзавы дом / Людміла Кебіч. – Гродна : ЮрСаПрынт, 2019. – 256 с.
2. Бэрак, Бэрак, дай цукерак! : беларускія міфалагічныя героі / Людміла Кебіч ; [мастак В. Фралова]. – Мінск : Народная асвета, 2020. – 28 с. – (Бібліятэка Асветыка).
3. Владеющий миром спорта : повесть о Владимире Чигиринове / Людмила Кебич ; под ред. В. Н. Чигиринова. – Гродно : Гродненская типография, 2021. – 160 с.
4. Гродно – город королей: [для среднего и старшего школьного возраста] / Людмила Кебич. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя , 2014. – 55, [1] с. – (История для школьников).
5. Дамінанты лёсу : аповесць / Людміла Кебіч ; [мастак А. І. Балыш]. – Мінск : Беларуская Энцыклапедыя, 2014. – 142 с.
6. Зялёная рутвіца : вершы / Людміла Кебіч. – Мінск : Беллітфонд, 2001. – 124 с.
7. Игрушки для Валюшки : стихи для детей младшего возраста / Людмила Кебич. – Гродно : ЮрСаПринт, 2018. – 23 с.
8. Іграшки Валюшки : вірші для дітей молодшого віку / Людмила Кебіч ; переклад українскою А. С. Верстак. – Гродно : ЮрСаПринт, 2021. – 23 с.
9. Ключы ад Неба : вершы / Людміла Кебіч. – Мінск : Про Хрысто, 2005. – 80 с.
10. Ключі від Неба : вірші / Людмила Кебіч ; переклад українскою А. С. Верстак. – Гродно : ЮрСаПринт, 2021. – 50 с.
11. На беразе белай ракі : апавяданні ў прозе і вершах / Людміла Кебіч. – Гродна, 2003. – 104 с.
12. На беразе белай ракі : апавяданні ў прозе і вершах. – 2-е выд, дап. / Людміла Кебіч. – Мінск : Беларускі рэспубліканскі літаратурны фонд, 2010. – 112 с.
13. Непераможны колер охры : вершы і паэмы / Людміла Кебіч. – Мінск, 2008. – 128 с.
14. Па музычных законах : вершы / Людміла Кебіч. – Ваўкавыск, 1996. – 89 с.
15. Пакінуць след на зямлі : нарысы / Людміла Кебіч. – Гродна, 2021. – 215 с.
16. Рай для адзіноты : кніга паэзіі / Людміла Кебіч ; мастак Я. У. Шэвякоў. – Мінск : Народная асвета, 2016. – 574 с.
17. Светач мастацтва : вершаванае адлюстраванне падзей у віншаваннях і прысвячэннях / Людміла Кебіч. – Гродна, 2008. – 87 с.
18. Словы прызнання [Ноты] : песні / Генадзій Кебіч, Людміла Кебіч. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2011. – 63 с.
19. Трыялеты, тэрцыны, рандэлі : [зборнік вершаў] / Людміла Кебіч ; [малюнкі А. Кебіч]. – Гродна : ЮрСаПрынт, 2020. – 86 с.
20. У Марьяны сто фантазий : веселые рассказы и стихи / Людмила Кебич. – Гродно: ЮрСаПринт, 2020. – 23 с.
21. Фиолетовый дракоша : стихи, рассказы / Людмила Кебич. – Гродно : Гродненская типография, 2007. – 61 с.
22. Як Алеся пальчыкі лічыла : вясёлыя апавяданні / Людміла Кебіч ; [мастак В. У. Фралова]. – Мінск : Народная асвета, 2016. – 23 с.

# Публікацыі

## Паэзія

### *Кніжныя публікацыі*

23. А там : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – Мінск, 2012. – С. 212.
24. Абдымі мяне : верш / Людміла Кебіч // На мове сэрца : зборнік беларускай паэзіі / [склад. Т. Ф. Рослік]. – Мінск, 2013. – С. 21–22.
25. Бабуліна песня : верш / Людміла Кебіч // На мове сэрца : зборнік беларускай паэзіі / [склад. Т. Ф. Рослік]. – Мінск, 2013. – С. 53–54.
26. Вярба : верш / Людміла Кебіч // На мове сэрца : зборнік беларускай паэзіі / [склад. Т. Ф. Рослік]. – Минск, 2013. – С. 18.
27. «Вясёлка над Кушлянамі», «Краснасельскія кар'еры», «У Полацку» : вершы / Людміла Кебіч // На прасторах любай Беларусі : зборнік прозы, паэзіі, публіцыстыкі / [складальнікі Г. П. Пашкоў, Т. Ф. Рослік]. – Мінск, 2015. – С. 59–63.
28. Да 170-годдзя з дня нараджэння Элізы Ажэшка : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – 2012. – С. 223–224.
29. Дзень апошні лістапада : верш / Людміла Кебіч // На мове сэрца : зборнік беларускай паэзіі / [склад. Т. Ф. Рослік]. – Мінск, 2013. – С. 70–71.
30. Дрэвы : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – Мінск, 2012. – С. 237.
31. З усіх дарог : верш / Людміла Кебіч // На мове сэрца : зборнік беларускай паэзіі / [склад. Т. Ф. Рослік]. – Мінск, 2013. – С. 74–75.
32. З усіх дарог ; Пакуль бягу ; Над Швейцарскай далінай ; Паэткам ; Наша восень ; Перад навальніцай ; Усё было ; Слухаючы парціту № 25 ; Ліпеньскі гром : вершы / Людміла Кебіч // На Нёманскай хвалі : літаратурны альманах / [рэдкалегія Л. А. Кебіч і інш.]. – Гродна, 2011. – № 2. – С. 48–51.
33. Завейка : верш / Людміла Кебіч // На мове сэрца : зборнік беларускай паэзіі / [склад. Т. Ф. Рослік]. – Мінск, 2013. – С. 32.
34. Застаюся адна : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – Мінск, 2012. – С. 219.
35. Збягаю ў вёску : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – Мінск, 2012. – С. 226–227.
36. Зімовая вандроўка : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – Мінск, 2012. – С. 212.
37. Зімовая вандроўка : верш // На прасторах любай Беларусі : зборнік прозы, паэзіі, публіцыстыкі / [складальнікі Г. П. Пашкоў, Т. Ф. Рослік]. – Мінск, 2015. – С. 62.
38. Знайду цябе : верш / Людміла Кебіч // На мове сэрца : зборнік беларускай паэзіі / [склад. Т. Ф. Рослік]. – Мінск, 2013. – С. 61–62.
39. Лівень : верш / Людміла Кебіч // На мове сэрца : зборнік беларускай паэзіі / [склад. Т. Ф. Рослік]. – Мінск, 2013. – С. 28–31.
40. Маладому беларусу : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – Мінск, 2012. – С. 213.
41. Маленькія радасці : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – Мінск, 2012. – С. 303–304.
42. Мая маленькая радзіма : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – Мінск, 2012. – С. 215–216.

43. На Беларусі ёсць паэты : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – Мінск, 2012. – С. 206.

44. На травеньскіх вуліцах Гродна: [верш] / Людміла Кебіч // На мове сэрца : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / [склад. Т. Ф. Рослік]. – Мінск, 2013. – С. 88–89.

45. Над ракой : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – Мінск, 2012. – С. 306–307.

46. Над швейцарскай далінай : [верш] / Людміла Кебіч // На Нёманскай хвалі : літаратурны альманах / [рэдкалегія Л.А. Кебіч і інш.]. – Гродна, 2011. – № 2. – С. 49.

47. Не гавары мне пра каханне : верш / Людміла Кебіч // На мове сэрца : зборнік беларускай паэзіі / [склад. Т.Ф. Рослік]. – Мінск, 2013. – С. 15.

48. Не засынай, мой любы Край... : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая . – Мінск, 2012. – С. 207.

49. Пакуль бягу : верш / Людміла Кебіч // На мове сэрца : зборнік беларускай паэзіі / [склад. Т. Ф. Рослік]. – Мінск, 2013. – С. 56–57.

50. Пакуль бягу : [верш] / Людміла Кебіч / Людміла Кебіч // На Нёманскай хвалі : літаратурны альманах / [рэдкалегія Л. А. Кебіч і інш.]. – Гродна, 2011. – № 2. – С. 48.

51. Паэт : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – Мінск, 2012. – С. 206.

52. Паэткам : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – Мінск, 2012. – С. 294–295.

53. Прадвызначэнне : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – Мінск, 2012. – С. 273.

54. Рамонкавы світанак : верш / Людміла Кебіч // На мове сэрца : зборнік беларускай паэзіі / [склад. Т. Ф. Рослік]. – Мінск, 2013. – С. 26.

55. Родныя карціны ; Хачу туды ; Але... ; Маёй Радзіме ; Не раўнуй : [вершы] // Мая Радзіма : зборнік прозы і паэзіі / укладальнік і аўтар прадмовы Алена Стельмах. – Мінск, 2019. – С. 64–68.

56. Роспач : верш / Людміла Кебіч // Фантазія творцы : зборнік сучаснай беларускай паэзіі / склад. Т. Ф. Рослік, К. І. Яроцкая. – 2012. – С. 315.

57. Скажыце мне : верш / Людміла Кебіч // На прасторах любай Беларусі : зборнік прозы, паэзіі, публіцыстыкі / [складальнікі Г. П. Пашкоў, Т. Ф. Рослік] . – Мінск, 2015. – С. 63.

